# Сусветнага ўзроўню каштоўнасці з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі

Адным з самых цікавых элементаў упрыгожвання кнігі з'яўляецца суперэкслібрыс. Нацыянальная бібліятэка Беларусі мае ў сваіх фондах старадрукі, адзначаныя экслібрысамі, якія паходзяць з прыватных кнігасховішч французскай арыстакратыі. Яны дэманструюцца ў гэтым месяцы ў Музеі кнігі.




- Суперэкслібрыс - гэта тое, што надае выключную каштоўнасць кнізе. Суперэкслібрыс маглі мець далёка не ўсе, сёння гэта з'ява больш рэдкая, чым пяць стагоддзяў таму, - падзяліўся думкамі кандыдат культуралогіі Алесь Суша. - Уладальніцкі знак на пераплётнай вокладцы з залачэннем, цісненнем і сімволікай - і ёсць экслібрыс.

Суперэкслібрысы захоўваюцца ў калекцыях большасці бібліятэк нацыянальнага ўзроўню, іх апісваюць у каталогах і выстаўляюць на выставах. Іх мелі прадстаўнікі шляхецкіх і магнацкіх родаў, заможная інтэлігенцыя ў XIX стагоддзі, іх маюць некаторыя сучасныя калекцыянеры. У фондах



Нацыянальнай бібліятэкі мы маем каштоўную калекцыю французскіх кніг з суперэкслібрысамі - гэта сусветнага ўзроўню каштоўнасці, якімі мы валодаем. Вывучаць гэтыя калекцыі пачыналі Тацццяна Рошчына і Галіна Кірэева, далучаны да гэтай тэмы маладыя даследчыкі Тацццяна Захарава і Анатоль Сцебурака. Шмат зрабіла для адкрыцця гэтай выставы Святлана Рыгораўна Пахоменкава. Мы яшчэ шмат чаго зробім для асэнсавання гэтай спадчыны. Нядаўна была выпушчана калекцыя паштовак з выявамі французскіх суперэкслібрысаў.

- Мы хочам прадэманстраваць гэты бок кніжнай культуры, - адзначыў кандыдат гістарычных навук Анатоль Сцебурака. - Мы маем цэлую калекцыю кніг з каштоўнымі вокладкамі, суперэкслібрысамі і з вялікім піетэтам глядзім на кнігі з манаршай бібліятэкі, якія з'яўляюцца сімвалам французскага каралеўства XIV-XVIII стагоддзяў. Тут прадстаўлены кнігі не толькі каралёў, але і іх жонак. Праз палітыку, праз культурныя сувязі, адукацыю беларускія землі былі знітаваныя з Французскім каралеўствам.

- У Францыі існавала некалькі тысяч экслібрысаў, а ў Расіі і на Украіне іх было значна менш, - распавёў калекцыянер Алег Аляксандравіч Судлянкоў. - На Беларусі іх мелі Гутэн-Чапскія, Радзівілы. Кнігі маюць шыкоўныя пераплёты, гэта адна з самых дарагіх скур, якія ішлі на пераплёт. Суперэкслібрысы не ведаюць падробак.

Навукова-даследчую працу па вывучэнні суперэкслібрысаў правяла Святлана Рыгораўна Пахоменкава.

*Э. Дзвінская,*
*фота аўтара.*